# Міхаіл Фёдаравіч ПІЛІПЕНКА

# Mihail Fjodaravich PILIPENKA



Вядомаму беларускаму этнолагу і гісторыку, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктару гістарычных навук, прафесару кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ Міхаілу Фёдаравічу Пілiпенку 19 мая споўнілася 80 гадоў. М. Ф. Піліпенка нарадзіўся ў 1936 г. у в. Нежыхаў Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы, затым у 1956 г. паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля яго заканчэння працаваў настаўнікам гісторыі ў Мамайскай васьмігадовай школе Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці, а затым у Капліцкай сярэдняй школе на Гомельшчыне. У 1964–1967 гг. вучыўся ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, пасля заканчэння якой з кастрычніка 1967 г. працаваў на гістарычным факультэце БДУ спачатку выкладчыкам кафедры гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, а потым дацэнтам кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.

Па запрашэнні кіраўніцтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі ў 1991 г. М. Ф. Піліпенка перайшоў на працу ў інстытут на пасаду загадчыка аддзела этналогіі. У 1993 г. ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную праблеме паходжання беларускага этнасу. Праз год яго выбралі членам-карэспандэнтам Акадэміі навук Беларусі, з мая 1994 па чэрвень 2004 г. працаваў дырэктарам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. У гэты перыяд раскрыўся талент М. Ф. Піліпенкі як актыўнага і адказнага кіраўніка, які згуртаваў калектыў установы вакол падрыхтоўкі і выдання фундаментальнай шматтомнай працы пад агульнай назвай «Беларусы», якая стала візітнай карткай беларускай гуманітарнай навукі. З 2004 г. Міхаіл Фёдаравіч працуе на пасадзе галоўнага навуковага супрацоўніка аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кіруе буйнымі навуковымі тэмамі і праектамі, вынікі якіх маюць важнае значэнне для нашай дзяржавы.

Працуючы ва ўніверсітэце, Міхаіл Фёдаравіч паспяхова чытаў агульны лекцыйны курс «Этнаграфія», а таксама спецыяльныя курсы «Этнаграфія Беларусі», «Метады этнаграфічных даследаванняў», «Этнічная гісторыя Беларусі», вёў практычныя і семінарскія заняткі, кіраваў курсавымі работамі. Шмат увагі М. Ф. Піліпенка надаваў падрыхтоўцы будучых этнографаў. Пад яго кіраўніцтвам паспяхова былі напісаны і абаронены дыпломныя работы студэнтаў, якія сёння працягваюць даследаванні ў галіне палявой этнаграфіі і тэарэтычнай этналогіі. Сваімі вучнямі Міхаіл Фёдаравіч лічыць усіх студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ, дзе ён выкладаў на працягу сарака гадоў. У гэты ж час М. Ф. Піліпенка сістэматычна займаўся навукова-даследчай работай. Ён распрацоўваў праблему этнагенезу і этнічнай гісторыі беларускага народа, пытанні эвалюцыі форм сям'і, сямейных і грамадскіх адносін, традыцыйных народных вераванняў беларусаў і інш. Шмат увагі вучоны надаваў таксама даследаванню тэарэтыка-метадалагічных пытанняў, гісторыі, сучаснаму становішчу і перспектывам развіцця беларускай этналагічнай навукі.

Міхаіл Фёдаравіч – вучоны шырокага дыяпазону і энцыклапедычных ведаў. Ён выдаў звыш ста навуковых прац, сярод якіх найбольш значнымі з'яўляюцца наступныя: «Сляды родавай арганізацыі ў вясельных звычаях славянскіх народаў» (1969); «Сям'я і шлюб у беларускіх сялян у другой палове XIX – пачатку XX ст.» (1970); «З гісторыі вывучэння беларускай этнаграфіі і фальклору» (1970);

«Даследаванні па гісторыі беларускай этнаграфіі» (1974); «Этнаграфія ў краязнаўстве» (1980); «Этнаграфія Беларусі» (1980); «Сучасныя этнічныя і культурна-бытавыя працэсы ў Беларусі» (1982), «Роля эвалюцыі і дыфузіі ў гісторыі традыцый» (1990); «Беларуская традыцыйная культура як феномен еўрапейскай цывілізацыі» (1995); «Сучасныя тэарэтычныя праблемы беларускай этналогіі» (2011). М. Ф. Піліпенка – суаўтар калектыўных прац «Беларуская народная педагогіка» (1996), «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў» (2000), шматтомнага выдання «Беларусы» (т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё (2001); т. 5: Сям'я (2001); т. 6: Грамадскія традыцыі (2002)) і інш.

Вынікам шматгадовай працы вучонага па праблеме паходжання беларускага народа стала новая канцэпцыя, выкладзеная ў манаграфіі «Узнікненне Беларусі. Новая канцэпцыя» (1991). Асноўныя палажэнні даследавання былі працягнуты і ўдакладнены аўтарам у больш позніх працах – «Канцэпцыі ўзнікнення Беларусі», «Старажытныя этнічныя супольнасці на тэрыторыі Беларусі», «Фарміраванне Русі», «Гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя, палітычныя ўмовы ўзнікнення Беларусі», «Усталяванне назвы "Беларусь"», апублікаваных у кнізе «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў». Аўтар адмовіўся ад уяўлення аб этнагенетычным працэсе паходжання беларусаў як спрошчанай эвалюцыі папярэдніх этнічных супольнасцей, а таксама тлумачэння этнагенезу вынікамі вялікіх міграцый старажытных славянскіх плямён. У сваім даследаванні ён улічвае ролю многіх фактараў (сацыяльна-эканамічных, палітычных, гістарычных), якія спрыялі фарміраванню беларускага этнасу і яго роднасці з іншымі ўсходнеславянскімі народамі, асаблівую ўвагу надае значэнню дыфузіі ў этнічных працэсах, прасторавай і эпахальнай перагрупоўкам, пераемнасці і зменлівасці кампанентаў культуры, мовы і самасвядомасці. Супаставіўшы даныя многіх крыніц, вучоны прыйшоў да высновы, што этнічная тэрыторыя сучаснай Беларусі сфарміравалася ў познім Сярэднявеччы ў выніку кансалідацыі паўночнай часткі палескага і паўднёвай часткі падзвінска-дняпроўскага субэтнасаў старажытнай агульнай усходнеславянскай (рускай) этнічнай супольнасці X–XIII стст. Гэтыя часткі старажытнарускай этнічнай супольнасці склалі аснову беларускага этнасу. Акрамя іх, у склад беларускага народа з цягам часу паступова ўвайшлі некаторыя асобныя групы заходнеславянскага (польскага), балцкага і цюркскага (татарскага) насельніцтва.

У якасці аўтара М. Ф. Піліпенка прымаў удзел у падрыхтоўцы і выданні «Беларускай савецкай энцыклапедыі», кароткай энцыклапедыі «Беларуская ССР», «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», энцыклапедычнага даведніка «Беларусь», энцыклапедый «Этнаграфія Беларусі», «Гісторыя Беларусі» (у 6 т.), «Беларускі фальклор», «Рэспубліка Беларусь», «Беларуская ўніверсальная энцыклапедыя» (у 18 т.) і інш. Міхаіл Фёдаравіч з'яўляецца членам навукова-рэдакцыйных саветаў, рэдакцыйных калегій і навуковым кансультантам шэрагу рэспубліканскіх часопісаў, сярод якіх «Беларускі гістарычны часопіс», «Роднае слова» і інш.

На працягу многіх гадоў М. Ф. Піліпенка плённа кіраваў падрыхтоўкай шматтомнага даследавання «Беларусы», прысвечанага прамысловым і рамесным заняткам, народнаму дойлідству, гісторыі этналагічнага вывучэння беларусаў, паходжанню і этнічнай гісторыі, сям'і, сямейным і грамадскім традыцыям, вуснай народнай творчасці, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, антрапалогіі беларускага народа.

Шмат часу і ўвагі надае Міхаіл Фёдаравіч падрыхтоўцы навуковых кадраў. Ён узначальвае адзіны ў нашай краіне спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый, выступае афіцыйным апанентам, кіруе навуковай працай магістрантаў і аспірантаў, з'яўляецца навуковым кансультантам дактарантаў, падрыхтаваў 3 дактароў і 10 кандыдатаў навук. Як вядомаму спецыялісту па беларускай этналогіі, аўтару шматлікіх грунтоўных прац, ініцыятыўнаму арганізатару навукова-даследчай работы, клапатліваму настаўніку, М. Ф. Піліпенку ў 1995 г. было прысвоена званне прафесара. У 1999 г. яму было прысуджана ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь. Загадам рэктара БДУ ад 25 лютага 2016 г. прафесару кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў М. Ф. Піліпенку за шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўклад у развіццё БДУ было прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка БДУ.

Свой юбілей Міхаіл Фёдаравіч сустракае ў росквіце творчага таленту, поўны цікавых ідэй і задум. У яго планах – падрыхтоўка грунтоўнай працы па беларускай этналогіі, дзе будзе звернута ўвага на тэарэтычныя аспекты гэтай навукі з улікам сусветнага вопыту, а таксама паказана яе прыкладное значэнне. М. Ф. Піліпенка актыўна ўдзельнічае ў навуковых дыскусіях, выступае з дакладамі на навуковых канферэнцыях, чытае лекцыі па праблеме этнагенезу беларускага народа. Вучні і калегі юбіляра шчыра віншуюць яго з 80-гадовым юбілеем і жадаюць яму моцнага здароўя, поспехаў і плёну ў працы, здзяйснення ўсіх планаў і задум.

*Т. А. Навагродскі*,
доктар гістарычных навук,
загадчык кафедры этналогіі,
музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ